Купить в Беларуси: http://belveter.by Купить в России: http://mlbv.ru

# Урок 1

# Агульныя звесткі аб мове

**Мэты:** фарміраваць уяўленне пра грамадскую сутнасць мовы, уменне асэнсоўваць пачутае, рабіць высновы; пашырыць веды вучняў пра гісторыю мовы, мовазнаўства, пра айчынных вучоных-моваведаў; стварыць умовы для выхавання нацыянальнай свядомасці, адказнасці за далейшы лёс роднай мовы.

**Абсталяванне:** інтэрактыўная дошка ці праектар з экранам, пры іх адсутнасці — выстава беларускамоўных кніг, слоўнікаў, партрэтаў славутых мовазнаўцаў Беларусі.

**Эпіграфы да ўрока:**

Кожны народ мае хаця б адзін геніяльны твор, і гэты твор — мова (*А. Разанаў*).

Мова не можа быць дрэннай або добрай… Бо мова — гэта толькі люстэрка. Тое самае люстэрка, на якое нельга наракаць (*С. Даўлатаў*).

### Ход урока

#### I. Арганізацыйны момант

#### II. Уступнае слова настаўніка

— Дарагія сябры, я віншую вас з пачаткам навучальнага, вашага апошняга школьнага года. Думаю, што ўжо гэтым годам начнецца ваша дарога ў будучыню, у цікавае жыццё, напоўненае дзіўнымі адкрыццямі, радасцю пазнання і сапраўднай дружбы. Спадзяюся, што гэты год будзе цікавым, насычаным падзеямі, поўным перамог і здзяйсненняў. Прапаную нам усім разам зрабіць яго менавіта такім.

Звярніце, калі ласка, увагу на словы Алеся Разанава і Сяргея Даўлатава, якія з’яўляюцца эпіграфамі да нашага ўрока. Ці задумваліся вы калі-небудзь, што такое мова, як яна ўзнікла, колькі на свеце існуе моў? *(Адказы вучняў.)* На сённяшнім уроку я запрашаю вас у падарожжа па гісторыі мовы.

#### III. Пастаноўка тэмы і мэт урока

#### IV. Лекцыя настаўніка

(Суправаджаецца слайдамі з адпаведнымі выявамі. Пры адсутнасці ТСН можна паказаць на дошцы адпаведныя схемы, звярнуць увагу на выставу партрэтаў і кніг.)

— Давайце паспрабуем даць азначэнне тэрміну «мова». *(Выказванні вучняў.)* Складана, праўда? Навуковыя даведнікі па-рознаму тлумачаць гэта слова. У асноўным, яны сыходзяцца на думцы, што **мова — гэта сродак чалавечых зносін**. *(Азначэнне на слайдзе ці на дошцы.)* Мова — сацыяльная з’ява, таму што яе ўзнікненне і існаванне магчыма толькі таму, што існуе чалавецтва. Па падліках вучоных, усяго ў свеце існуе каля 5 тысяч моў. Па колькасці носьбітаў адной мовы на першым месцы знаходзіцца Кітай (больш за 1 мільярд), а па колькасці моў у межах адной дзяржавы — Індыя (845 моў). Да прыкладу, у Інданезіі налічваецца каля 200 моў, у Дагестане — каля 30, у Швейцарыі — 4 мовы (нямецкая, французская, італьянская і рэтараманская). І наадварот, адной мовай карыстаюцца жыхары некалькіх краін: нямецкая мова родная для немцаў і аўстрыйцаў, для значнай часткі насельніцтва Швейцарыі і Люксембурга.

— Навошта, на вашу думку, чалавеку мова? *(Адказы вучняў.)* Правільна, для зносін, захавання і перадачы вопыту, выражэння думак, пачуццяў, эмоцый. Каб служыць сродкам зносін, мова павінна выказваць усё, што мы ведаем пра навакольны свет, грамадства і яго развіццё, пра сябе і нават пра саму мову. Таму ў моўных сродках замацоўваецца каласальная праца чалавецтва ў пазнанні свету. У мове чалавек адлюстроўвае тое, што для яго больш важнае, значнае ў жыцці. Таму ў адной мове людзі лепей вызначалі асаблівасці снегу, бо іх продкі жылі ў тундры на працягу стагоддзяў і адрозненне колеру снегу было вельмі важным для жыцця, у некаторых арабскіх дыялектах жыхароў пустыні шмат назваў для пяску, у трэцяга народа — падрабязная моўная класіфікацыя дажджу. Некаторыя мовы маюць багатую, старанна распрацаваную навукова-тэхнічную тэрміналогію, у іншых такога багацця няма, але заўсёды мова адпавядае надзённым патрэбам. Напрыклад, беларуская мова мае больш за 20 назваў балота, якое з’яўляецца прыкметнай адзнакай беларускага ландшафту: *багна, бездань, валага, гала, дрыгва, дрыгвянік, імшара, мроіва, мярэча, слата, твань, тхлань* і інш. Большасць гэтых слоў не маюць эквівалентаў у іншых нацыянальных мовах.

— Як вы думаеце, якая мова ўзнікла першай? *(Адказы вучняў.)*

*(Выступленне падрыхтаванага вучня.)*

На самой справе яшчэ ў Старажытным Егіпце людзі задумваліся пра тое, якая мова самая старажытная, гэта значыць ставілі праблему паходжання мовы. Так, Герадот распавядае пра цара Псамеціха (663—610 гадоў да н. э.), які пачаў збіраць звесткі пра паходжанне людзей. Цар загадаў аддаць два нованароджаныя немаўляці ад простых бацькоў пастуху для выхавання сярод статка коз. Паводле загаду Псамеціха, забаранялася ў прысутнасці дзяцей вымаўляць словы. Валадар вельмі жадаў пачуць, якое першае слова скажа адно з дзяцей пасля няпэўных гукаў. Пастух прыводзіў казу ў асобны пусты будан, карміў і даглядаў малых. Так ён дзейнічаў на працягу двух гадоў. Аднойчы, калі пастух адчыніў дзверы і ўвайшоў у пакой, абодва немаўляці падпаўзлі да яго і,



Купить в Беларуси: http://belveter.by Купить в России: http://mlbv.ru

Купить в Беларуси: http://belveter.by Купить в России: http://mlbv.ru

# Змест

Урок 1. Агульныя звесткі аб мове . . . . . 1
Урок 2. Правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, чысціня, дарэчнасць, багацце і выразнасць маўлення . . . 5
Урок 3. Правілы маўленчых паводзін. Маўленчы этыкет . . . . . 10

## СТЫЛІСТЫКА

Урок 4. *(Варыянт I)* Функцыянальныя стылі (навуковы, афіцыйны, публіцыстычны, мастацкі, гутарковы) 13
Урок 4. *(Варыянт II)* Функцыянальныя стылі (навуковы, афіцыйны) . . . . . 17
Урок 5. *(Варыянт I)* Функцыянальныя стылі (навуковы, афіцыйны, публіцыстычны, мастацкі, гутарковы). Практычныя заняткі . . . . . 21
Урок 5. *(Варыянт II)* Функцыянальныя стылі (публіцыстычны, мастацкі, гутарковы) . . . . . 24
Урок 6. Кантрольны дыктант . . . . . 28

## СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ. КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ

Урок 7. Словазлучэнне; віды, спосабы і сродкі сінтаксічнай сувязі ў словазлучэнні . . . . . 30
Урок 8. Сінтаксічныя нормы: асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове . . . . . 33
Урок 9. Сказ, асноўныя функцыі сказа . . . . . 35
Урок 10. Пісьмовая творчая работа. Пісьмовае выказванне на тэму «Шчасце жыць у мірнай краіне» . . . . 38
Урок 11. Сінтаксічныя прыметы двухсастаўных сказаў. Сінтаксічныя нормы: парадак слоў, сувязь дзейніка і выказніка ў сказе . . . . . 41
Урок 12. Сінтаксічныя прыметы аднасастаўных сказаў, няпоўных сказаў . . . . . 44
Урокі 13—14. Кантрольны падрабязны пераказ тэксту . . . . . 46
Урокі 15—16. Сінтаксічныя прыметы сказаў з аднароднымі членамі; ужыванне, знакі прыпынку . . . . . 48
Урок 17. . . . . . 50

Купить в Беларуси: http://belveter.by Купить в России: http://mlbv.ru

Купить в Беларуси: http://belveter.by Купить в России: http://mlbv.ru

УДК 372.811.116.13.046.14
ББК 74.268.1Беи
Б43

Серыя заснавана ў 2016 годзе

С к л а д а л ь н і к і : **Л. М. Бурвін, В. А. Войткус, Т. А. Копаць**

Р э ц э н з е н т ы :
кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры сучаснай беларускай мовы БДУ **З. І. Бадзевіч**;
настаўніца беларускай мовы і літаратуры ДУА «Гімназія № 42 г. Мінска лаўрэата Нобелеўскай прэміі Ж. І. Алфёрава» **А. І. Гулякевіч**

Б43 **Беларуская мова.** Планы-канспекты ўрокаў. 11 клас (І паўгоддзе) : дапаможнік для педагогаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі / [склад.: Л. М. Бурвін, В. А. Войткус, Т. А. Копаць]. — Мазыр : Белы Вецер, 2017. — 52 с. — (Серыя «Урокі: практычны вопыт»).

ISBN 978-985-587-376-2.

Дадзены дапаможнік змяшчае метадычныя распрацоўкі ўрокаў, якія адпавядаюць патрабаванням школьнай праграмы, зацверджанай Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, структуры дзеючага падручніка, а таксама складзены з улікам патрабаванняў да сучаснага ўрока. Разам з тым, сваім зместам дадзенае выданне цалкам адпавядае ўзроўню сучаснага развіцця навукі аб мове, метадычным патрабаванням да выкладання прадмета.

Прызначаны настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

**УДК 372.811.116.13.046.14**
**ББК 74.268.1Беи**

Вытворча-практычнае выданне

*Серыя «Урокі: практычны вопыт»*

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА. ПЛАНЫ-КАНСПЕКТЫ ЎРОКАЎ
## 11 клас (І паўгоддзе)

0+

Дапаможнік для педагогаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі

С к л а д а л ь н і к і :
**БУРВІН** Людміла Мікалаеўна
**ВОЙТКУС** Вольга Аляксандраўна
**КОПАЦЬ** Таццяна Аляксандраўна

Адказны за выпуск *А. У. Дзянісава*

Купить в Беларуси: http://belveter.by Купить в России: http://mlbv.ru